ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

*Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь*

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №4 (146)
САКАВІК 2022 ГОДА

ПАЛІТЫЧНЫ ПЕРАСЛЕД

«ТУРЭМНЫ ДЗЁННІК» ВІКТАРА БАРЫСЕНКАВА

Шэраг допісаў фотамастака Віктара Барысенкава на старонцы ў Фэйсбуку прысвечаныя разважанням пра адбыванне арышту ў Віцебскім ІЧУ, які часова месціцца на тэрыторыі СІЗА-2. 46 асобных, адмыслова пранумараваных пастоў – гэта не столькі апісанне быту або распарадку дня ў ізалятары, колькі рэфлексіі аўтара пра тое, як ён апынуўся за кратамі, з якім стаўленнем да сябе сутыкнуўся і ці лічыць справядлівым пакаранне.

«Іншым разам кажуць, што турма – гэта карная машына дзяржавы. Магчыма. Калі ўлічыць, што ў гэтай машыны няма ні руху, ні карыснай работы. Я ж лічу, што турма - гэта метафара дзяржавы. Як жа яны падобныя ў прыгнятанні правоў і свабод, у цкаванні талентаў і ў насаджэнні грамадска-прымусовай працы, якія ж яны блізкія ў сваім стаўленні да здароўя і культуры, наколькі яны аналагічныя ў гвалце і прыніжэнні слабога!» – гаворыцца ў перадапошнім, 45-м допісе віцебскага краязнаўцы Віктара Барысенкава.

13 жніўня мінулага году краязнаўцу і фотамастака Віктара Барысенкава асудзілі на 7 сутак. Прычынай стала фота часоў Другой сусветнай вайны. На здымку вызваленага Віцебска, які ён апублікаваў у сацыяльнай сетцы «ВКонтакте», савецкія салдаты ў 1944 годзе разглядаюць трафейны нацысцкі сцяг са свастыкай. Барысенкава абвінавацілі ў прапагандзе нацысцкай сімволікі (ч. 1 арт. 19.10 КаАП), хаця ў судзе ён тлумачыў, што гэта сапраўднае архіўнае фота, знятае нямецкім фатографам-камуністам, і яно знаходзіцца ў вольным доступе на дзясятках сайтаў.

Рашэнне суддзі Кастрычніцкага райсуду Уладзіміра Царыкава спадар Барысенкаў спрабаваў абскардзіць у Віцебскім абласным судзе. Ён тлумачыў, што суддзя Царыкаў праігнараваў заўвагу да артыкулу 19.10. КаАП, згодна з якой не з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем публічнае дэманстраванне і захоўванне нацысцкай сімволікі ў сувязі з калекцыянаваннем культурных каштоўнасцяў і адукацыйнай дзейнасцю пры адсутнасці прыкмет прапаганды нацысцкай сімволікі.

У абласным судзе Віктар Барысенкаў даводзіў, што ён сам з'яўляецца нашчадкам дзядоў, загінулых падчас апошняй вайны, і што збіраў здымкі ў віртуальны фотаальбом «Віцебск падчас нямецкай акупацыі», бо калекцыянуе гістарычныя фатаграфіі, займаючыся адукацыйнай дзейнасцю. Аднак суддзя Ірына Смалякова пакінула ў сіле рашэнне суду Кастрычніцкага раёну Віцебску, нягледзячы на заслугі Віктара Барысенкава перад горадам: у абласны суд ён прынёс шматлікія граматы ад розных навучальных і культурніцкіх установаў, дзе чытаў лекцыі па краязнаўстве, і прыгадаў некалькі фотавыставаў, дзе экспанаваліся ягоныя творчыя працы.

"Віцебская вясна"

ЯЎГЕН СЦЯПАНАЎ: «МАЕ ЗАЯВЫ – ГЭТА МАЯ ЗБРОЯ!»

Пратэсты супраць вайсковай агрэсіі Расеі супраць Украіны праходзяць зараз у розных фарматах. У розных краінах свету людзі выходзяць на шматтысячныя мітынгі.

У Беларусі, рызыкуючы трапіць у пастарунак, а потым у ІЧУ, нехта адважваецца надзець жоўта-блакітны шалік ці выйсці з букетам жоўтых і блакітных кветак. Жыхар Віцебску Яўген Сцяпанаў абраў свой шлях супраціву: ён піша звароты да дзяржаўных кіраўнікоў і дэпутатаў, не даючы ім забыцца на адказнасць за маўчанне і нежаданне выступіць за мір.

Адзін з першых лістоў быў накіраваны дэпутатцы гарсавету Валянціне Багатыровай. Атрымаў допіс ад Яўгена Сцяпанава і Старшыня Віцебскага гарвыканкаму Мікалай Арлоў. У лісце да дзяржаўнага чыноўніка выкладзены патрабаванні абвясціць фармаванне антываеннага руху і падтрымаць любыя формы антываенных пратэстаў; патрабаваць неадкладнага вываду расейскіх войскаў з тэрыторыі Беларусі, лічыць вайсковымі злачынцамі ўсіх, хто прымаў рашэнне пра вайсковыя дзеянні ва Украіне, і хто санкцыянаваў агрэсіўную прапаганду, якая апраўдвае вайну, у дзяржаўных беларускіх медыях.

Свае патрабаванні спыніць вайну ва Украіне Яўген Сцяпанаў накіраваў і дзяржаўным асобам вышэйшага рангу – міністру абароны Рэспублікі Беларусь, кіраўніку ўзброеных сіламі краіны, Генеральнаму пракурору РБ. Жыхар Віцебску піша, што як чалавек і грамадзянін не даваў згоды на прысутнасць расейскіх войскаў на тэрыторыі сваёй краіны. Таму ад свайго імя, як прадстаўніка грамадзянскай супольнасці, ён забараняе пакідаць у Беларусі замежных вайскоўцаў, а таксама выкарыстоўваць тэрыторыю краіны для нанясення ўдараў па замежных дзяржавах. Таксама *«я забараняю ўдзел у вайсковых канфліктах за межамі Рэспублікі Беларусь усім вайсковым служачым Узброеных сіл РБ»*, – піша Яўген Сцяпанаў.

Адзіны «кантынгент», які віцяблянін прапануе адмыслова дасласць у зону вайсковага канфлікту, гэта *«супрацоўнікі сілавых структур, якія праявілі асаблівую адвагу, выкарыстоўваючы фізічную сілу, спецыяльныя сродкі і зброю супраць бяззбройных грамадзянаў, жанчын, пенсіянераў, і інвалідаў падчас пратэстных падзеяў падчас і пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 году»*.

На думку Яўгена Сцяпанава, ягоныя лісты дасягаюць сваёй мэты, хоць адказаў на іх ён пакуль не атрымаў. Выкарыстоўваючы палажэнні закону аб зваротах грамадзянаў, чыноўнікі і дзяржслужбоўцы абавязаны даць адказ на працягу 30-ці дзён. Але адказ трымаць давядзецца абавязкова, і не толькі ў пісьмовай форме, перакананы жыхар Віцебску.

Андрэй Кот
"Віцебская вясна"

КАМІТЭТ ААН

СМЯРОТНЫ ПРЫСУД ПРЫВЕДЗЕНЫ Ў ВЫКАНАННЕ

Камітэт ААН па правах чалавека асуджае выкананне смяротнага прысуду ў дачыненні да жыхара Віцебскага раёну Віктара Паўлава.

С 2010 года Віктар Паўлаў з'яўляецца ўжо 15-й па ліку асобай, пакаранай Рэспублікай Беларусь падчас разгляду яго справы Камітэтам ААН па правах чалавека, нягледзячы на неадназовыя просьбы Камітэта прыпыніць выкананне прысуду на час разгляду яго скаргі аб заяўленых ім парушэннях яго правоў.

Віктар Паўлаў быў затрыманы 3 студзеня 2019 года па падазрэнні ў здзяйсненні забойства і крадзяжы маёмасці. У гэты ж дзень, у адсутнасць адваката, ім былі падпісаныя прызнавальныя паказанні, і пракурор санкцыянаваў меру стрымання ў выглядзе зняшчэння пад варту. Упершыню Паўлава прывезлі ў суд толькі праз пяць месяцаў пасля яго затрымання. У ліпені 2019 года Віцебскі абласны суд асудзіў яго да вышэйшай меры пакарання. У лістападзе таго ж года Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь пакінуў у сіле прысуд суда першай інстанцыі.

Скарга Паўлава ў Камітэт ААН па правах чалавека была пададзена ў 2020 годзе і ўтрымлівае заявы аб ужыванні да яго катаванняў у месцах зняволення, аб адмове ў доступе да юрыдычнай дапамогі і аб несправядлівым судовым разглядзе. Камітэт зарэгістраваў скаргу і пачаў вытворчасць па падрыхтоўцы яе да разгляду.

Камітэт неаднаразова накіроўваў Рэспубліцы Беларусь просьбы аб прыпыненні выканання смяротнага прысуду, а пачынаючы з чэрвеня 2021 года таксама прасіў прадаставіць інфармацыю аб месцазнаходжанні Віктара Паўлава ў сувязі з інфармацыяй пра магчымае таемнае выкананне смяротнага прысуду. Аднак ні на адзін з запытаў Камітэт не атрымаў адказаў.

Некаторы час назад Віцебскі абласны суд нарэшце праінфармаваў сям'ю Паўлава, што смяротны прысуд быў прыведзены ў выкананне, але не прадаставіў інфармацыю пра дату пакарання ці месца, дзе пахаванае цела Віктара Паўлава.

У падобных справах, якія тычацца таемнага выканання смяротнага пакарання, Камітэт ААН па правах чалавека раней выявіў парушэнне Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Камітэт таксама ўжо прызнаваў невыкананне Рэспублікай Беларусь працэдур Камітэта і невыкананне яго просьбаў аб прыняцці часавых мер абароны парушэннем Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, бо ўсе дзяржавы-ўдзельнікі абавязаны ў адпаведнасці з міжнародным правам добрасумленна супрацоўнічаць з Камітэтам.

Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе і Цэнтральнай Азіі, якая ўжывае смяротнае пакаранне. У сваім апошнім дакладзе па Беларусі, апублікаваным у лістападзе 2018 года (ёсць на англійскай і рускай мовах), Камітэт па правах чалавека падкрэсліў, што Рэспубліцы Беларусь "варта разгледзець пытанне аб увядзенні мараторыя на смяротнае пакаранне ў якасці першага кроку на шляху ўсталявання заканадаўчай забароны смяротнага пакарання і ратыфікацыі другога Факультатыўнага пратаколу да Пакта, замяніць усе смяротныя прысуды турэмным зняволеннем і актывізаваць высілкі дзеля змены грамадскай думкі аб неабходнасці захавання смяротнага пакарання".

Нягледзячы на тое, што смяротны прысуд у дачыненні да Віктара Паўлава ўжо быў прыведзены ў выкананне, Камітэт ААН па правах чалавека, у адпаведнасці са сваёй практыкай, працягне разгляд яго справы на адной са сваіх будучых сесій.

Ян Сведка

САНКЦЫІ

ЦІ ПАГРАЖАЕ ДЫФІЦЫТ?

Якія тавары знікнуць ці істотна падаражэюць з-за санкцый? У дэфіцыце будуць зусім не грэчка, соль і алей, якімі беларусы традыцыйна закупляюцца ў чаканні крызісу.

«Гэта ўсё прадукты ўласнай вытворчасці альбо расійская прадукцыя, — тлумачыць эканаміст і сябра палітрады Аб’яднанай грамадзянскай партыі Леў Марголін у інтэрв’ю праекту „Філін“. — Калі нешта і можа стаць дэфіцытам, то гэта імпартныя тавары.

Названыя вышэй прадукты — гэта больш набор для вайны, але я ўсё ж такі спадзяюся, што на тэрыторыі Беларусі ваенных дзеянняў не будзе.

Што тычыцца імпартных тавараў, адзначу, што яны рэзка падаражэлі. Цэны на іх будуць расці. Адпаведна, яны аўтаматычна становяцца менш даступнымі для большасці груп насельніцтва.

Некаторыя тавары стануць недаступнымі па прычыне, што многія міжнародныя кампаніі прыпыняюць або спыняюць супрацоўніцтва з беларускімі гандлёвымі сеткамі, нават нягледзячы на наяўнасць або адсутнасць санкцый — па ўласнай ініцыятыве.

Галоўны крытычны імпарт для нашай краіны — гэта, перш за ўсё, медыкаменты. Яны стануць даражэй у 1,5 — 2 разы, і да гэтага трэба быць гатовым.

Што тычыцца тавараў працяглага карыстання, яны могуць знікнуць з паліц, таму што людзям, у якіх ёсць запасы ў рублях, больш выгадна закупіць тэлевізары, халадзільнікі, пліты і гэтак далей. Калі яны планавалі такія пакупкі, гэта паскорыць іх рашэнне.

З іншага боку, гэта можа быць нядрэнным укладаннем грошай. Цэны на гэтыя тавары растуць не так хутка, як курсы ў абменніках. Чым купляць даляр па завышаным курсе, лепш укласці ў тавар. Але гэта больш пытанне захавання назапашанняў, чым спажывання».

“Салідарнасць”

ЭКАНОМІКА

ДЕТСКОЕ ПИТАНИЕ ИЗ НОВКИ

В этом году в одном из цехов ООО «Белфуд Продакшн» увеличат мощности производства на 30%, начнётся выпуск 4 новых видов продукции. Также предприятие по выпуску детского питания запустит четыре новых вида продукции. Об этом во время визита председателя Витебского облисполкома Александра Субботина сообщил директор предприятия Виталий Белов, передает корреспондент БЕЛТА.

«Более 50% продукции ООО „Белфуд Продакшн“ идет на экспорт. Полезные и экологически чистые продукты для малышей поставляются в 13 стран, в том числе Европы и Азии. Основным рынком сбыта для нас является Российская Федерация. Потребитель из соседней страны выбирает практически ту же продукцию, что и белорусский. С этого года начнем выпускать еще четыре новых вида продукции и запустим новые линейки», — рассказал руководитель предприятия.

«Белфуд Продакшн» обеспечивает четверть белорусского рынка детского пюре. В целом за месяц здесь могут производить до 15 млн упаковок продукции. «Это соки в тетрапаках, мясное, мясо-растительное, рыбное, рыбно-растительное, овощное, фруктовое, фруктово-овощное пюре в стеклянной таре и мягкой упаковке — паучах. На предприятии в трех цехах работники трудятся в несколько смен 24/7. Сырье все натуральное, мясное — белорусского производства. Предназначено такое питание для детей от четырех месяцев, поэтому ответственность, которая ложится на нас как на производителей, мы все понимаем. Ежедневно большая лаборатория производит контроль качества продукции», — подчеркнула заместитель директора по производству Татьяна Мызникова.

На предприятии продукция проходит не один этап проверки качества — от загрузки сырья до обеззараживания упаковки. В некоторые цеха не допускается никто, кроме операторов. За всеми показателями следит специалист через компьютер. Готовый продукт упаковывается с соблюдением всех санитарных норм. Проверка целостности упаковки, стерилизация, пастеризация, сохранение максимального количества полезных веществ в продукте — каждая технология четко выверена и отлажена.

Глава области ознакомился с высокотехнологичным производством и отметил, что перспективы у «Белфуд Продакшн» радужные. «Предприятие достаточно емкое, большое и, судя по брендам и продукции, очень известное. Линейка детского питания — это всегда особый товар с высокими требованиями к нему. Это уже высшая лига в сфере производства продуктов питания. У предприятия есть большие планы на расширение и развитие. Они готовы изобретать, выходить на новые рынки, и поэтому надо помогать по мере сил», — поделился мнением Александр Субботин

Руководитель предприятия и председатель облисполкома обсудили возможные трудности из-за обстановки в мире. Виталий Белов рассказал, что на предприятии достаточные запасы сырья, а новые рынки сбыта ищут постоянно, поэтому «Белфуд Продакшн» не должно ощутить больших потрясений.

БелТА

КРЫМІНАЛ

ПОДЖЕГ ЖЕНЩИНЫ

Следственным управлением УСК по Витебской области завершено расследование уголовного дела об изнасиловании, иных действиях сексуального характера и убийстве, совершенном с особой жестокостью.

По данным следствия, ночью 20 ноября 2021 года 32-летний мужчина на улице познакомился с 38-летней женщиной. В магазине они приобрели спиртное, которое распивали на лестничной площадке в доме по месту жительства обвиняемого. Воспользовавшись тем, что потерпевшая была пьяна и не могла сопротивляться, он избил ее и изнасиловал, затем поджег на женщине одежду и скрылся с места происшествия.

Вечером того же дня тело погибшей обнаружили жильцы дома и позвонили в правоохранительные органы. 22 ноября мужчину задержали.

Следователи допросили свидетелей и обвиняемого, провели проверку показаний на месте. Изучили личность обвиняемого – ранее он привлекался к уголовной ответственности за умышленное причинение тяжкого телесного повреждения. Изъята одежда и обувь мужчины, в которой он находился во время совершения преступления. К материалам уголовного дела приобщены записи камер видеонаблюдения, расположенные по пути следования обвиняемого и потерпевшей.

К материалам уголовного дела приобщили заключения экспертиз, проведенных УГКСЭ по Витебской области. Судебно-медицинской экспертизой установлено, что смерть женщины наступила на месте происшествия от травм, термических ожогов и травматического шока. Это говорит о том, что мужчина поджег потерпевшую, когда она была жива.

На изъятых в ходе осмотра места происшествия фрагментах зажигалки в ходе судебной биолого-генетической экспертизы обнаружен биологический материал обвиняемого, на одежде мужчины обнаружены биологические клетки потерпевшей.

Согласно заключению комплексной судебной психолого-психиатрической экспертизы, в период совершения преступления обвиняемый в состоянии аффекта не находился, следовательно, он мог в полной мере сознавать значение своих действий и руководить

По результатам расследования 32-летнему мужчине предъявлено обвинение по ч.2 ст.166 (изнасилование, совершенное лицом, ранее совершившим действия, предусмотренные статьей 167 УК Республики Беларусь), ч.2 ст.167 (иные действия сексуального характера, совершенные вопреки воле потерпевшей с применением насилия, с использованием беспо-мощного состояния потерпевшей, совершенные лицом, ранее совершившим изнасилование), п.п.2, 6, 7 ч.2 ст.139 (убийство, заведомо находящегося в беспомощном состоянии, совершенное с особой жестокостью, сопряженное с изнасилованием и насильственными действиями сексуального характера) Уголовного кодекса Республики Беларусь. К нему применена мера пресечения в виде заключения под стражу.

Расследование уголовного дела завершено, материалы переданы прокурору для направления в суд.

«Віцьбічы»

ЗАТРЫМАНЫ ЗА ПАДРЫХТОЎКУ ТЭРАКТА

Паводле МУС, віцяблянін рыхтаваў тэракт на чыгунцы. Як паведамляе Тэлеграм-канал «МУС Беларусі», 49-гадовы Сяргей Канавалаў які планаваў вывядзенне са строю сістэм, якія забяспечваюць бяспеку чыгуначнага руху. Да ўказанага абсталявання ён меў доступ, бо працаваў у арганізацыі, якая ўваходзіць у структуры Беларускай чыгункі.

Паводле меркавання следчых, у лютым-сакавіку гэтага году, “паддаўшыся заклікам дэструктыўных тэлеграм-каналаў”, мужчына рыхтаваўся да грамадска-небяспечных дзеянняў, накіраваных на дэзарганізацыю функцыянавання чыгуначнага транспарта. У прыватнасці, планаваў парушыць працу сустрэм, адказных за бяспеку чыгуначнага руху. Дзеянні жыхара Віцебску, імя і прозвішча якога СК не называе, кваліфікаваны як падрыхтоўка да акту тэрарызму, распачата крымінальная справа.

3 сакавіка Генеральная пракуратура распачала крымінальную справу паводле ч. 3 арт. 289 КК (акт тэрарызму, учынены арганізаванай групай) на падставе матэрыялаў Следчага камітэту «аб злачынствах супраць бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту».

Паводле звестак МУС, 28 лютага і 1 сакавіка на тэрыторыі Магілёўскай, Гомельскай і Менскай абласцей «зафіксаваны тры факты знішчэння сігнальнага абсталявання, блакавання чыгуначных шляхоў». Не менш як тры чалавекі затрымалі ў Стоўбцах і Жодзіне Менскай вобласці, 2 сакавіка быў затрыманы жыхар Асіповічаў, што на Магілёўшчыне. Паводле МУС, у пачатку 2022 году ён « увайшоў у склад экстрэмісцкага фармавання ByPol, аўтарызаваўшыся ў мабілізацыйным чат-боце для ўчынення супрацьпраўных дзеянняў у Беларусі. 1 сакавіка мужчына атрымаў указанні па блакаванні чыгуначных шляхоў, а таксама па вырабе і выкарыстанні «кактэйляў Молатава». У дачыненні да яго распачалі крымінальную справу за «удзел у экстрэмісцкім фармаванні з мэтай учынення злачынстваў экстрэмісцкай накіраванасці».

На датычнасць да “чыгуначнай справы” праводзяцца праверкі як у структурах БЧ, так і ў аматарскіх інтэрнэт-суполках. Так, краязнаўца Кастусь Шыталь, які вывучае гісторыю чыгункі, паведаміў пра з’яўленне невядомых асобаў у чаце аматараў чыгуначнага транспарту Railwayz.info: гэтыя асобы задаюць удзельнікам праваахоўныя пытанні і нават дасылаюць пагрозы.

Ян Сведка

МЕРКАВАННЕ

«ЛУКАШЕНКО ЧУЕТ, ЧТО АКЕЛА-ПУТИН ПРОМАХНУЛСЯ»

Экономист Ярослав Романчук — о том, что в мире происходит, наконец, моральное избавление от real politic, где главное — деньги. И чего ждать.



Все больше брендов и компаний объявляют о том, что уходят как из России, так и из Беларуси. Этот массовый исход белорусы прочувствуют на себе, причем не в отдаленной перспективе, а уже в ближайшее время, отмечает известный белорусский экономист Ярослав Романчук, который находится в Киеве.

— Это такой очень жесткий способ выучить законы, причем не только экономики, но демократии и общечеловеческих ценностей, — сказал эксперт в экспресс-комментарии «Салідарнасці». — В ситуации, когда Лукашенко воспринимается частью кампании агрессора в войне против Украины, естественно, в мировом сообществе, особенно с учетом репутации Лукашенко 2020-2021 года, особо не разбирают степень вовлеченности белорусского режима.

Сегодня происходит, наконец, моральное избавление от real politic, где главное — деньги, «бабки», а остальное вторично. Наверное, впервые в мировой экономике мы имеем прецедент, когда во главу угла международные компании ставят иные ценности — ценность жизни, ценность мира.

Даже такой гигант, как Coca-Cola, который работал даже в Советском Союзе, не мог не реагировать на обструкцию, устроенной компании по всему миру за то, что она решила остаться в России, и в итоге решил оттуда выйти.

Поэтому те белорусы, которые ностальгировали по советской экономике, думали, что централизованное плановое хозяйство — хорошо, государственная собственность — это хорошо, теперь на собственной шкуре убедятся, что это такое.

Это радикальное сокращение инвестиций, это технологическая деградация, сотни тысяч разрушенных рабочих мест, дыра в бюджете. Резкое падение качества жизни, начиная с самого начала — памперсы, продукты гигиены, лекарства, сбор ребенка в школу, связь, образование, инструменты, комплектующие, технологии.

Каждый белорус даже не осознавал, каким количеством иностранных товаров и слуг он пользуется, считая это чуть ли не само собой разумеющимся.

Те компании, которые дружно вышли или анонсировали выход из России и Беларуси, демонстрируют переход в новый мир, в котором, в отличие от зомбированных марксистов, не «все за деньги». Происходит детоксикация сознания белорусов от Госплана, «совка 2.0».

Санкции против России радикально ускорят этот процесс, подчеркивает аналитик, особенно с ощутимой угрозой милитаризации и населения и призыва тысяч мужчин на военную службу.

— Кто хочет быть частью агрессии, чтобы тебя застрелили в Украине и потом стыдливо прятали трупы, потому что тебя, якобы, здесь, нет?

В общем, происходит действительно тектонический слом, та точка бифуркации, которая, получается, растянулась на три года с 2020-го — но теперь уже все.

Дефицит бюджета, падение доходов — про пенсии можно забыть. Те пенсионеры, которые голосовали за Лукашенко и считали, что Запад — это плохо и он загнивает, получат возможность убедиться, к чему может привести реализация их пожеланий.

Русские не ожидали, что давление будет происходить так резко, потому что все предыдущие годы с ними якшались, проходили инвестиционные форумы — Валдайский, Красноярский, Питерский, Московский — у Путина и его окружения сложилось ощущение, что деньги, вывезены из страны, будут работать и никуда не денутся. Но когда, по сути, они начали Третью мировую войну — это уже не про прибыль, а про существование цивилизации. Ставки слишком высоки.

Это гигантская, грубейшая ошибка Путина. И то, что Лукашенко, хотя говорили о готовности войск, таки не решился послать армию в Украину, много значит. Он очень хитрое политическое создание, думаю, он уже чует, что Акела-Путин промахнулся, не хочет вместе с ним уйти в небытие и пытается хоть как-то выйти из этой ситуации.

Однако, по мнению экономиста, опасно думать, что во всем виновата только Россия, а Беларусь вообще не при чем:

— Белорусская плановая экономика как раз была частью проблемы, с которой мы столкнулись. Было бы иначе — не было бы у нас такой диктатуры, такой военной хунты, были бы гораздо более устойчивые институты развития; но вся существующая зависимость от России, контрабандный схематоз привели к тому, что мы тоже «приплыли».

Появляется шанс катарсиса — но если не выучить уроки, то его не будет. Не хотелось бы доходить до уровня Ирана, Венесуэлы, Северной Кореи. Но если представить, что Украина побеждает (а в этом нет никаких сомнений), то ее ждет бум обновления, а в России и Беларуси, если не будет критических изменений, ждет именно деградация по венесуэльскому и северокорейскому сценарию.

Виктория Прокопович
gazetaby.info

АНАЛІТЫКА

БЕЛАРУСКАЙ МАДЭЛІ ЗАСТАЛОСЯ НА ТРЫ ДНІ?

На зыходзе трэцяга дзесяцігоддзя будаўніцтва беларускай мадэлі ва ўвесь рост паўстала праблема «выжывання большасці галін» — а значыць, і мадэлі ў цэлым!

Вялікае бачыцца на адлегласці. Спатрэбілася пражыць два разы па трыццаць тры гады, а потым яшчэ тры гады, каб усвядоміць усю глыбіню «Казкі пра рыбака і рыбку». Яна не пра рыбака і рыбку. Яна пра Саюзную дзяржаву, дакладней, пра яе самоту.

Не верыце? Тады звярніцеся да прэс-рэлізу апаратыўнай нарады з вайскоўцамі на галоўным сайце краіны: «Трэба быць разам з тым, хто... Ну з кім мы можам быць разам? З палякамі? Ніколі. Вы бачыце іх пазіцыю. З прыбалтыйскімі рэспублікамі? Дык яны самі прыткнуліся да кагосьці. З украінцамі — вы бачыце, што ў нас атрымалася».

…Наша яна, матухна, наша. Не сумнявайцеся. Таму і газ за 128,52 «зялёных». Розніца на парадак! Без гэтай розніцы не відаць сярэднестатыстычнаму беларусу сярэднестатыстычнага заробку ў 657 долараў у снежні. Аднак гэта ў снежні — з улікам выплат па выніках года і пры курсе ў 2,55 рублі за долар. А якім ён будзе ў сакавіку?

Не ўсё ў руках Божых, сёетое і прэзідэнту Джозэфу Байдэну дасталося. Днямі ён распарадзіўся пра ўвядзенне ў дачыненні да Расіі новых «магутных» санкцый: «Мы абмяжуем магчымасць для Расіі весці бізнес у доларах, еўра, фунтах, енах, быць часткай сусветнай эканомікі».

Дык ці ж тое пагроза! Ніколі ў сваёй гісторыі Расія не імкнулася стаць нечай часткай, таму жылі, жывуць і будуць жыць большасць расійскіх старых людзей у старых зямлянках, але з пачуццём прыналежнасці да вялікай дзяржавы.

«Ціха сам з сабою…»

Адным з сінонімаў слова «імпартазамяшчэнне» з'яўляецца слова «ананізм». Абодва маюць прамое дачыненне да слова «самазадавальненне». Вікіслоўнік дазваляе азнаёміцца і са значэннямі слова. Ён рэкамендуе чытачам, зацікаўленым па эканамічнай тэматыцы, кнігу гісторыка Арона Гурвіча «Катэгорыі сярэднявечнай культуры».

Сярэднявечная культура, сярэднявечная эканоміка натуральным чынам заточаныя на самазадавальненне. Але, як аказалася, і сучаснасць яму не чужая.

Канкрэтны прыклад. Паводле звестак партала Aviation Experts, 93 працэнты замежных самалётаў забяспечваюць практычна ўсе пасажырскія перавозкі ў Расіі. 60 працэнтаў рынку займаюць пры гэтым самалёты Airbus і Boeing.

З таго ж дакумента вынікае, што да 2030 года авіякампаніям Расіі спатрэбіцца каля 700 новых самалётаў. Эксперты нагадваюць, што адзіным грамадзянскім самалётам, які выпускаецца серыйна на постсавецкай прасторы, з'яўляецца Superjet 100. У 2021 годзе выраблена 23 самалёты, у 2022 годзе чакаецца яшчэ 18.

Невялікае ўдакладненне наўздагон: на 80% расійскі суперсамалёт складаецца з імпартных дэталяў…

З імпартазамяшчэннем вас, дарагія таварышы! З самазадавальненнем!

«Вы гатовыя плаціць?»

У сваёй публічнай лекцыі, прачытанай за дзень да пачатку расійскай агрэсіі супраць Украіны, прафесар Чыкагскага ўніверсітэта Канстанцін Сонін прывёў, сярод іншых, і наступны факт: «Прыкладна з 2008 года ідзе стагнацыя — сярэднія тэмпы росту меншыя, чым падчас застою 1970-х гадоў».

Чым скончыўся застой, мяркую, можна не нагадваць. Адным з трыгераў, якія запусцілі лавінападобны працэс дэградацыі савецкай мадэлі, паслужыў увод войскаў у Афганістан. Але дзе той Афганістан і дзе Украіна? Калі да таго (да ўвядзення маштабных эканамічных санкцый) расійская эканоміка стагнавала, дык чаго варта чакаць цяпер?

Памыліцца той, хто палічыць апошняе пытанне рытарычным. У Пасланні—2022 на яго быў дадзены разгорнуты адказ: «Мы многае, калі не ўсе, зможам зрабіць самі. Гэта ўмова захавання нашага суверэнітэту, патрэбна толькі сістэмная і ўпарадкаваная праца па забеспячэнні эканамічнай самадастатковасці краіны.

Усё ў нас гэта ёсць. Таму намечаныя планы па імпартазамяшчэнні з'яўляюцца асновай выжывання большасці галін, дазволяць адысці ад санкцыйнай уразлівасці. Пытанню імпартазамяшчэння будзе нададзеная першасная ўвага ў наступнай пяцігодцы».

На зыходзе трэцяга дзесяцігоддзя будаўніцтва беларускай мадэлі ва ўвесь рост паўстала праблема «выжывання большасці галін» — а значыць, і мадэлі ў цэлым!

Думка пра тое, што мадэль аказалася каля чырвонай рысы, чырвонай жа ніткай праходзіць праз усё Пасланне—2022. Пра гэта, калі хто не зразумеў, і тры пытанні, звернутыя да беларускага грамадства. Не магу ўтрымацца, каб не нагадаць іх: «Ці гатовыя вы, беларусы, плаціць за ўласную абарону, за ўласную дзяржаву?», «Вы гатовыя плаціць за гэта дарагую цану, імя якой — суверэнітэт і незалежнасць?» і «Ці гатовыя вы быць ініцыятыўнымі і працаваць на сябе?»

Як тут ні прыгадаць плакат часоў Грамадзянскай вайны з чырвонаармейцам: «Ты запісаўся...», " Ты гатовы...".

Асабіста я быць ініцыятыўным і працаваць на сябе гатовы. І гэты опус — яскравае таму сведчанне.

Сяргей Нікалюк
novychas.online

МЕРКАВАННЕ

НАПАД РАСІІ НА УКРАІНУ СТАЎ ПАЧАТКАМ ТРЭЦЯЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ?

Джордж Сорас пракаментаваў напад Расіі на Украіну. Па словах амерыканскага фінансіста, Пуцін «вырашыў пакараць Украіну за тое, што яна супраціўляецца, і стаў дзейнічаць без усялякіх тармазоў».

Напад Расіі на Украіну 24 лютага стала пачаткам Трэцяй сусветнай вайны. Пра гэта ў сваім артыкуле, які апублікавала выданне Project Syndicate, заявіў амерыканскі фінансіст і заснавальнік фонду «Адраджэнне» Джордж Сорас.

На думку Сораса, гэтая вайна патэнцыйна можа знішчыць нашу цывілізацыю.

У артыкуле гаворыцца, што перад уварваннем прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін і старшыня Кітая Сі Цзіньпін апублікавалі вялікі дакумент, у якім абвяшчалася аб цесным партнёрстве паміж дзвюма краінамі.

«Я быў здзіўлены, што Сі відавочна дае Пуціну карт-бланш на ўварванне і развязванне вайны супраць Украіны», — адзначыў Сорас.

«Пуцін жа, заручыўшыся падтрымкай Сі, заняўся ажыццяўленнем мары ўсяго свайго жыцця з неверагоднай жорсткасцю. Неўзабаве Пуціну споўніцца 70 гадоў, і ён адчувае, што, калі ён хоча пакінуць след у расійскай гісторыі, яму трэба дзейнічаць альбо цяпер, альбо ніколі», — гаворыцца ў артыкуле.

На думку Сораса, Пуцін мае намер стаць царом для Расіі і, «прыдумаўшы сабе ідэю фікс, Пуцін відавочна страціў сувязь з рэальнасцю».

«Я не ведаю Пуціна асабіста, але вельмі ўважліва назіраю за яго ўзвышэннем і ведаю, што ён бязлітасны. Ён ператварыў у руіны чачэнскую сталіцу Грозны, а цяпер пагражае зрабіць тое ж самае з украінскай сталіцай Кіевам», — напісаў фінансіст.

Па словах Сораса, Пуцін чакаў, што рускамоўныя ўкраінцы будуць сустракаць расійскіх салдат з хлебам-соллю, але моцна памыліўся.

«Ён [Пуцін. — рэд.] вырашыў пакараць Украіну за тое, што яна супраціўляецца, і стаў дзейнічаць без усялякіх тармазоў. Ён кінуў у бой усю расійскую армію і ігнаруе любыя правілы вайны», — адзначыў Сорас.

Паводле яго слоў, не выключана, што Расія прайграе гэтую вайну, паколькі заходнія партнёры пастаўляюць Украіне абарончыя віды ўзбраенняў.

«Тым часам Сі, падобна, зразумеў, што Пуцін сарваўся са шпулек... Сі патэлефанаваў прэзідэнту Францыі Эмануэлю Макрону і канцлеру Германіі Олафу Шольцу і заявіў, што падтрымлівае іх міратворчыя намаганні. Ён хоча максімальнай стрыманасці ў гэтай вайне, каб прадухіліць гуманітарны крызіс. Няма ніякіх гарантый, што Пуцін саступіць пажаданням Сі. Мы можам толькі спадзявацца, што Пуцін і Сі будуць адхіленыя ад улады да таго, як яны знішчаць нашу цывілізацыю», — зрабіў высновы Сорас.

Паводле www.unian.net

ГЕРОЯМ СЛАВА

СІЛА ВЯРБЫ ВЯДОМАЙ КАМБАТАНТКІ, ЯКАЯ БЫЛА ШМАТДЗЕТНАЙ МАЦІ

25 лютага 2022 года ў самым пачатку новай вайны Расіі супраць Украіны ў баях за Кіеў загінула Ірына Цьвіла — вядомая камбатантка, фотамастачка, ваенная фотахранікёрка, аўтарка ваенных занатовак, якая з 2014 года сведчыла свету аб тым, што ў вайны жаночае аблічча.

Настаўніца па адукацыі, Ірына стала грамадскай актывісткай, журналісткай і фотамастачкай падчас Рэвалюцыі Годнасці. На Еўрамайдане зразумела, што мірна жыць Украіне Расія не дазволіць, а таму вырашыла абараняць краіну не проста ўдзелам у акцыях ці настаўніцтвам, а са зброяй у руках.

Улетку 2014 года яна стала добраахвотніцай з ваенным пасведчаннем у батальёне «Січ» (Сеч) — цяпер гэта полк спецпрызначэння «Київ».

Яшчэ падчас Майдану, потым АТА (антытэрарыстычнай аперацыі) на Усходзе Украіны яна пачала фіксаваць рэвалюцыю і вайну на камеру.

У 2017 годзе адбылася персанальная выстава фотамастачкі — «Від Майдану до АТО».

Але перадусім яна была камбатанткай і не любіла, калі яе называлі ваеннай журналісткай ці проста фотамастачкай, хоць жанчынаў часта прымацоўвалі да прэсслужбы, каб выхаваць ім жыцці. Ірына стамілася ад аберагання і настаяла на баявых заданнях. Яна прайшла крывавыя абстрэлы пад Славянскам, баі ў Пясках (Данеччына).

З маладосці палюбіла кветкі, займалася ружамі, у якіх хавалася ў цяжкія моманты. А яшчэ на вайне яе здзівіла і зачаравала сіла вярбы: абстраляная, знявечаная, падаецца, вынішчаная, яна насупор усяму аднаўлялася і квітнела. Сіла вярбы давала сілу і ёй на вайне. У гэтым дрэве Ірына пабачыла мацату Украіны, якая аднаўляецца насуперак агрэсіі.

У ветэранскім жыцці Ірына доўга шукала сябе, не магла адаптавацца да цывільнага жыцця. Дзякуючы праекту «Посестри» прайшла трэнінг і вырашыла скіраваць энергію на стварэнне прыгожага — так, паўстаў праект VERBA . Ірына стварала біжутэрыю на аснове кветак не толькі вярбы, але і іншых раслінаў.

Калі-нікалі яна дзялілася сваімі ваеннымі ўспамінкамі: падчас рэдкіх публічных выступаў ці ў друку. Так, у 2017 годзе апублікавала свае занатоўкі пра вайну ў калектыўнай кнізе «Голос війни: історії ветеранів» (Голас вайны: гісторыі ветэранаў). Таксама сталася гераіняй кнігі «Дівчата зрізають коси» (Дзяўчаты зразаюць косы), якая атрымала Шаўчэнкаўскую прэмію.

На ўварванне Расіі ва Украіну 24 лютага 2022 года Ірына зрэагавала імгненна — яна вярнулася на вайну. 25 лютага ў баях за Кіеў загінула разам з спадарожнікам жыцця Дзмітром. Сіротамі засталіся іх пяцёра дзяцей.

Мажліва, запаветам Ірыны можа стаць ейнае ж выказванне ў адным з інтэрв'ю: «Можа, я разрадаюся, калі надыдзе перамога, а пакуль няма часу кіснуць». Слава Украіне!

Уладзіслаў Гарбацкі
novychas.online

ПОГЛЯД З УКРАІНЫ

«СЕЙЧАС В УКРАИНЕ РЕШАЕТСЯ НЕ ТОЛЬКО СУДЬБА УКРАИНЫ, НО И СУДЬБА БЕЛАРУСИ»

Шансов остаться братьями мало, но шансов остаться людьми много. Известный врач — об опасности расчеловечивания.

Политик Андрей Дмитриев поговорил с известным детским врачом Евгением Комаровским. Доктор, который с начала войны с семьей находился в Харькове, рассказал о том, что происходит в городе и как меняются настроения людей.

...Поначалу, когда в пять утра мы проснулись от канонады, у меня было ощущение, что я пришел в это кино, сейчас побегут какие-то титры, а у мамы будут дрожать руки — потому что в 41-м году они уезжали с бабушкой из Харькова в эвакуацию в Сибирь.

Мой дед не мог смотреть фильмы о войне, не мог слышать ни одного выстрела, хотя прошел всю войну. И когда отец показывал мне коробку с орденами, то делал так, чтобы дед не видел — потому что он их ненавидел и никогда не надевал. Он считал войну самым страшным, самым жутким, что было в его жизни.

И этот лозунг, который так много звучал... Они действительно доказали всему миру, что могут повторить. Понимаете, как это страшно? Когда в Украине был лозунг «Никогда больше», то в России был лозунг «Можем повторить». Они были готовы к этому, а мы не хотели понимать, не верили, что это реально возможно — это был сюр, шизофрения... Вот так мне это видится.

На заявления российской пропаганды о необходимости «денацификации» Украины и плохом отношении к русским Евгений Комаровский — русскоязычный, из, пожалуй, самого русскоязычного города в стране — приводит свой личный пример. И поясняет: в Украине очень трепетно относятся к своей независимости — «это как новорожденное дитя», и когда на это покушаются, учат, как жить, это воспринимают в штыки:

— В ответной реакции, вне всякого сомнения, тоже бывают перегибы. Но огромное количество людей в Украине абсолютно демократическими методами пыталось найти золотую середину. Сейчас ее уже нет.

Настроения людей, отмечает врач, меняются каждый день: первые два дня многие были уверены, что все быстро закончится и вернется в норму.

…Меня очень волнует — стремительно нарастающий градус ненависти. Все самое светлое, что было: мирный, один из самых красивых городов Европы, чистенький, вылизанный харьковчанами и властями, где в первые дни бомбежек продолжали вывозить мусор — и видеть, как этот город убивают на глазах, какое у тебя чувство?! Когда утром общий чат-перекличка — живой, неживой, у нас в огород упала ракета — вот так мы живем, понимаете?..

И вот это чувство ненависти, в топку которого каждый день подбрасываются дрова. Потому что это не прекращается, более того, интенсивность обстрелов увеличивается при том очевидном факте, что неделю стреляют по Харькову, уничтожая военные объекты (народу России и Беларуси ведь так говорят?) — вы что, криворукие ***, за неделю не можете высокоточным оружием попасть в военные объекты?! Или теперь стреляете по городу, чтобы убить живую силу, потому что страшно ножками прийти сюда?...

Врач также обратился к белорусам:

— Друзья мои. Хочется сказать: братья-белорусы — вы же еще братья, вы же от нас не отреклись? Вам сейчас решать, как жить дальше, потому что сейчас в Украине решается не только судьба Украины, но и судьба Беларуси.

Самое малое, что вы можете для нас сделать — хотя бы остаться в стороне, сделать все, чтобы со стороны Беларуси не было агрессии. Хотя бы невмешательство в этот «братский» конфликт. Обо всем остальном, пожалуй, я могу только мечтать.

Отдельно хочется обратиться ко всем силовикам, офицерам. Офицерская честь — подумайте, что для вас в этом слове? Может ли офицер поднять руку на женщину, выстрелить в направлении, где, даже теоретически, может быть ребенок? Подумайте об этом. Шансов остаться братьями мало, но шансов остаться людьми много. Давайте их не упустим.

gazetaby.info

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 15.03.2022 у 19.15
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.